## § 7. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне)

**Успамінаем і паўтараем**

**39.** Вусна прадоўжыце сказы.

1. Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па … . 2. Склад з адной літары нельга … . 3. Пры пераносе слоў літары … не аддзяляюцца ад папярэдняй літары. 4. Пры пераносе слоў не раздзяляюцца спалучэнні літар … .

Якія з названых пунктаў правіл пераносу слоў можна праілюстраваць наступнымі прыкладамі: *бай-ка, са-джаць, ігол-ка, праў-да, паль-ма, на-дзея*?

**40.** Прачытайце табліцу. На кожны пункт правіл пераносу слоў прывядзіце ўласныя прыклады, запішыце.

| Правілы пераносу слоў | Прыклады |
|---|---|
| З аднаго радка на другі словы пераносяцца па складах | *пе-рамога, пера-мога, перамо-га* |
| Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнне зычных, то пераносіцца на наступны радок або ўсё гэта спалучэнне, або любая яго частка | *га-рбуз, гар-буз, збо-жжа, збож-жа* |
| Нельга пакідаць або пераносіць на наступны радок адну літару | *асі-на, чы-тае, юнак* |
| Нельга раздзяляць пры пераносе спалучэнні літар ***дж*** і ***дз***, калі яны абазначаюць гукі [д͡ж], [д͡з], [д͡з’] | *гля-дзяць, гля-джу* |
| Спалучэнні ***дж*** і ***дз*** можна раздзяляць пры пераносе, калі ***д*** адносіцца да прыстаўкі, а ***з***, ***ж*** — да кораня | *пад-жаць, ад-звінець* |
| Ад папярэдняй літары не аддзяляюцца літары ***й***, ***ў***, ***ь*** і апостраф | *вай-на, поў-ны, кась-ба, пад’-ём* |

**41.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак у форме пытальнага сказа.

Вылез з зямлі расточак, а на ім — два **доўгія** лісцікі. Потым **з'явілася** махнаценькая сцяблінка, а на ёй — лісцік з **пяццю** зубчыкамі. Сцяблінка пакрыта **тоненькімі** валасінкамі.

Расце сцяблінка, **таўсцее**, новыя лісцікі на ёй з'яўляюцца.

Вось на адной сцяблінцы кветачка расцвіла — вялікі жоўты званочак. Адцвіце кветачка, пялёсткі **ападуць**, а на сцяблінцы застанецца **маленькі** агурок[сн] *(Паводле С. Фядотавай)*.

Запішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу.

Знайдзіце ў тэксце памяншальна-ласкальныя словы *(расточак, лісцікі, ...)*. З якой мэтай яны ўжываюцца аўтарам?

**42.** Размяркуйце словы па групах:

*расцвісці́*

а) словы, якія нельга падзяліць для пераносу;
б) словы, пры пераносе якіх магчымы толькі адзін варыянт;
в) словы, пры пераносе якіх дапускаюцца два варыянты.

Пошта, аб'езд, жыццё, пудзель, якар, алея, каўнер, унук, лічба, шайба, ідэя, месца.

**43.** Запішыце назвы гарадоў па-беларуску, падзяляючы іх на склады і для пераносу.

Волковыск, Жодино, Иваново, Заславль, Вилейка, Ивье, Марьина Горка.

Прывядзіце 2-3 прыклады назваў беларускіх гарадоў, якія нельга падзяліць для пераносу.

**44.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

У жыцці часам здараюцца такія непрыемны.. сітуацыі, калі мы робім памылкі або выпа..кова крыў..ім кагосьці. Выхаваны чалавек заўсёды прызнае сваю віну і папрасіць



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

прабач..ння. Для такіх выпа..каў у беларускай мове ёсць шэраг выразаў: «Прабачце!», «Выбачайце!», «Даруйце!», «Прашу прабачэння!», «Не крыўдуйце!», «Не сярдуйце!», «Не злуйцеся!». Калі чалавека перапыняюць пры размове, кажуць: «Перапрашаю!» *(Паводле С. Зелянко).*

Навошта, на вашу думку, трэба прасіць прабачэння?

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце словы, якія нельга падзяліць для пераносу.

Як вы просіце прабачэння, калі крыўдзіце аднакласнікаў, бацькоў?

## § 8. Галосныя гукі

**Успамінаем і паўтараем**

**45.** Вусна адкажыце на пытанні.

Колькі галосных гукаў у беларускай мове? Назавіце іх.

Чаму яны атрымалі такую назву?

Які галосны гук не сустракаецца ў пачатку слоў у беларускай мове?

Якія галосныя гукі вымаўляюцца звычайна пад націскам?

!

**Галосныя гукі** ўтвараюцца з дапамогай голасу. Пры іх вымаўленні паветра праходзіць праз поласць рота свабодна, не сустракаючы перашкод.

У беларускай мове 6 галосных гукаў: [а], [о], [у], [ы], [і], [э]. Для іх абазначэння на пісьме выкарыстоўваецца 10 літар: ***а, о, у, ы, э, е, ё, і, ю, я.***

**46.** Прачытайце тэкст. Якой гістарычнай падзеі прысвечаны помнік пагранічнікам?

### Помнік пагранічнікам

У Брэсцкай крэпасці ёсць помнік пагранічнікам і іх **сем'ям**, якія загінулі ў **першыя** дні Вялікай Айчыннай вайны.